# Прэзентацыя пяцігадовага праекта

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла прэзентацыя Міжнароднага славістычнага праекта "Гісторыя кніжнай культуры". Узначальваў выкананне гэтага праекта намеснік старшыні ГА "МАБ" доктар філалагічных навук Юрый Лабынцаў, які загадвае Цэнтрам беларусазнаўчых даследаванняў Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук. Аб'ектам вывучэння былі помнікі пісьменства прыгранічнай часткі Польшчы, а выдаваліся прадугледжаныя праектам кнігі пераважна ў Мінску.

Сябры асацыяцыі гаварылі пра выкананне праекта як пра здзяйсненне сапраўднага навуковага подзвігу. За 5 гадоў у рамках праекта з'явілася ажно 14 кніг. У іх раскрыты памежнасць духоўнай культуры Падляшша, узаемадзеянне ў ёй усходніх і заходніх, праваслаўных і каталіцкіх традыцый. Беларуская літаратура ўзбагацілася невядомымі раней помнікамі. Паказана роля Заблудаўскай друкарні Хадкевічаў, друкарні і бібліятэкі Супрасльскага манастыра. Працы праекта публікаваліся на беларускай, польскай і рускай мовах.

На прэзентацыі праекта прысутнічалі і выступілі дыпламатычныя прадстаўнікі Польшчы, Расіі і Украіны.

**Тамара ШКУРКО.**